*Бандурына Крысціна*

# ФІЛАСОФСКА-ЭТЫЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў РАМАНЕ РОБЕРТА ПЭНА УОРАНА "УСЕ ВАЯРЫ КАРАЛЯ"

*(Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дацэнт Г. М. Бутырчык)*

Цікаўнасць да філасофскай і этычнай праблематыкі на сённяшні дзень абумоўлена шэрагам прычын, сярод якіх, перш за ўсё, – немагчымасць канчатковага вырашэння "адвечных пытанняў" філасофіі і этыкі, якія патрабуюць асэнсавання кожным асобным пакаленнем людзей. Са змяшчэннем акцэнту на індывіда і яго прыватнае жыццё маральныя праблемы сталі пераходзіць з метафізікі ў прагматыку: з'яўляюцца шматлікія прыкладныя дысцыпліны ў агульнай сістэме этыкі і філасофіі (сацыяльная філасофія, філасофія навукі, філасофія гісторыі, бізнес-этыка, інфармацыйная этыка, эканамічная этыка і г.д.). Пераход да прагматыкі пазбаўляе маральныя праблемы філасофскага характару, што прыводзіць да нівеліравання аксіялагічнай значнасці гэтых праблем. Таму зварот да філасофска-этычнай праблематыкі ў літаратуры бачыцца нам канструктыўным спосабам захавання базавай каштоўнаснай парадыгмы ў полі этыкі і філасофіі як светапогляду.

У аснову рамана "Усе ваяры караля" ("All the King's Men", 1946) Роберта Пэна Уорана пакладзена гісторыя амерыканскага палітыка, губернатара штата Луізіяна Х'юі Лонга, які стаў прататыпам галоўнага героя Вілі Старка. Сюжэт разгортваецца вакол палітычнай кар'еры Вілі Старка: герой праходзіць шлях ад простага, наіўнага скарбніка-перфекцыяніста да эгаістычнага і жорсткага губернатара штата. Гісторыя паказана вачыма аднаго з найбліжэйшых паплечнікаў Старка Джэка Бёрдэна – інтэлігента і інтэлектуала, гісторыка па адукацыі і журналіста па прафесіі. Раман прынята разглядаць як палітычны, але вуснамі Бёрдэна прамаўляецца шмат філасофскіх ідэй, якія выходзяць далёка за межы палітыкі. Мы зрабілі спробу адысці ад традыцыйнага ўспрымання рамана і прааналізаваць абраны мастацкі тэкст праз закладзеныя ў яго філасофскія і этычныя канцэпцыі.

Сістэма філасофскіх ідэй у рамане грунтуецца на перапляценні шматлікіх канфліктаў і поглядаў, якія ў творы, па меры разгортвання сюжэта, з дапамогай шматлікіх флэшбэкаў і гісторый пабочных герояў дазваляюць адрозніць сутнаснае ад неістотнага і выявіць тое зерне, з якога прарастае цэласная аўтарская філасофска-этычная канцэпцыя.

Раман мае некалькі ўзроўняў канфліктаў, на кожным з якім асобна, пад пэўным вуглом разглядаецца ўся вядомая чалавецтву мараль і этыка:

–канфлікт унутры сістэмы / сістэмны крызіс;

–канфлікт поглядаў розных людзей;

–унутраны канфлікт аднаго героя.

Сістэма, у якой вымушаныя існаваць героі, стварае фон для развіцця іх унутраных канфліктаў. У ёй трывала замацаваныя і функцыянуюць абсалютна кардонныя, на першы погляд, Малы Дафі і Сэдзі Бёрк, Рафінад,

МакМёрфі – з аднаго боку, і суддзя Ірвін, Адам і Анна Стэнтаны, губернатар Стэнтан – з другога. Паміж імі знаходзяцца "шараговыя суб'екты Гісторыі": маці Джэка Бёрдэна, Вучоны Пракурор, Люсі Старк, бацька Вілі Старка і г.д. Сістэмы быццам не існуе – пакуль героі не сутыкаюцца з ёю нос да носу, а насамрэч гэта яна трымае ў сваіх руках усе нябачныя вяровачкі ад жыцця.

Праз канфлікт поглядаў розных людзей адбываецца паглыбленне ў мікракосм герояў, павярхоўны ўзровень сістэмы адыходзіць на задні план і становіцца фонам, на якім ўзаемадзейнічаюць галоўныя персанажы: Джэк Бёрдэн і Вілі Старк. Прычым выразнага антаганізму ў поглядах не назіраецца. Хутчэй ёсць іх суіснаванне – спачатку вымушанае, а пасля – добраахвотнае.

Аналіз сістэмы персанажаў даў магчымасць выявіць найбольш важныя кропкі сутыкнення пазіцый герояў у дачыненні да канкрэтных маральных праблем. Дзякуючы прынцыпу супастаўлення характараў дасягаецца магчымасць адлюстравання розных канцэпцый, якія ў рамане ў выніку сплятаюцца ў адну лагічную сістэму. Такім чынам, розныя, на першы погляд, пазіцыі Джэка Бёрдэна і Вілі Старка ў рэшце рэшт аказваюцца двума бакамі аднаго медаля, а супрацьстаянне "маральных аўтарытэтаў" суддзі Ірвіна, губернатара Стэнтана, яго сына Адама, з аднаго боку, і Малога Дафі, МакМёрфі, Гумі Ларсана – з другога – на ўзроўні адной палітычнай сістэмы аказваецца рухам адзінага механізму, якім кіруе Вілі Старк.

Джэк Бёрдэн і Вілі Старк праходзяць складаны шлях эвалюцыі, і іх унутраныя канфлікты, тыя змены, якія адбываюцца з імі на працягу ўсяго аповеду, – гэта, у пэўным сэнсе, адлюстраванне крызісу ўсёй сістэмы, не здольнай функцыянаваць у адпаведнасці з агульнапрынятымі законамі. З узаемазвязанасці сістэмы і асобнага чалавека і вынікае такая складаная парадыгма філасофскіх канцэпцый, якія ўвесь час змяняюць адна адну – па меры разгортвання сюжэта і эвалюцыі герояў. Калі Джэк Бёрдэн сутыкаецца з той рэчаіснасцю, якая ніяк не стасуецца з яго поглядамі, ён пачынае вынаходзіць для сябе такія сродкі, якія дазволілі б палегчыць супярэчнасці паміж ім і светам. Тым жа шляхам – паступовым і малазаўважным – адбываецца распад сістэмы: калі ў ход ідуць любыя сродкі (гвалт, прымус, подкуп і г.д.), для таго каб дасягнуць неабходнага, каб працягнуць яе існаванне.

Твор пабудаваны на некалькіх філасофскіх канцэпцыях, і вельмі важным з'яўляецца тое, што ўсе яны цесна звязаныя паміж сабою. У аснове ўсяго ляжыць аўтарскае разуменне Часу. Час у Р. П. Уорана – своеасаблівы механізм усталявання справядлівасці, які ў кароткатэрміновай перспектыве ў розных сітуацыях успрымаецца апавядальнікам Джэкам Бёрдэнам то як "Вялікі Цік" ("The Great Twitch"), то як "павуціна" ("the web of things"). Па сутнасці, такое разуменне часу з'яўляецца адлюстраваннем будысцкага закону кармы або "эфекту бумеранга", пад якім у сацыяльнай псіхалогіі разумеецца вяртанне супрацьлеглага, у параўнанні з чаканым, выніку. Для пісьменніка існуе два паняцці часу: час, якім мы вымяраем працягласць нашых дзеянняў, і Час як метафізічная надбудова над жыццём чалавека.

Раман у цэлым пабудаваны як матрошка, але і кожная асобная праблема – свая дадатковая матрошка ўнутры рамана.

Цікавымі з’яўляюцца некаторыя моманты ў эвалюцыі Джэка Бёрдэна і Вілі Старка, звязаныя з названымі канцэпцыямі. Так, адразу пасля гісторыі з шантажам суддзі Ірвіна, якая скончылася яго самагубствам, Вілі Старк перажывае смерць сына, а Джэк Бёрдэн, які ў маладосці не здолеў узяць на сябе адказнасць за ўласную будучыню, вымушаны назіраць за тым, як каханая жанчына, Анна Стэнтан, уступае ў сувязь з Вілі Старкам. Нягледзячы на ўнутранае падабенства і цесную сувязь гэтых двух персанажаў, іх эвалюцыя адбываецца рознымі шляхамі: характар Вілі Старка развіваецца лінейна, у Джэка Бёрдэна развіццё ўскладняецца пастаяннымі вяртаннямі да мінулага.

Гульня з часам рэалізуецца і на ўзроўні аповедных стратэгій: гісторыя расказваецца як быццам адным і тым жа чалавекам, гісторыкам і журналістам Джэкам Бёрдэнам, але на самой справе мы бачым, што гэта тры розныя Бёрдэны з розным багажом ведаў і вопыту і рознымі сістэмамі каштоўнасцей: “да-Бёрдэн”, “Бёрдэн” і “пост-Бёрдэн”. Праз гэтае раздзяленне рэалізуецца канцэпцыя “ненадзейнага апавядальніка”: аўтар нідзе не папярэджвае чытача пра тое, што яго чакаюць гісторыі трох розных людзей замест адной.

Асобнай увагі заслугоўвае праблема ўлады. У рамане яна сягае значна шырэй за межы палітычнай улады і закранае сферу маралі. Вілі Старк, харызматычны лідар, які трымае ў сваіх руках усе мажлівыя інструменты ўлады, мае магчымасць не толькі рэалізацыі сваіх палітычных амбіцый і кантролю над штатам, але і над свядомасцю падначаленых, над свядомасцю мас. Мы паспрабавалі разгледзець гэтую праблему праз прызму “псіхалогіі мас” З. Фрэйда і з прыкладаннем вынікаў знакамітага “эксперыменту Мілгрэма” (тэорыя “паўсядзённасці зла”).

Вілі Старк з’яўляецца хрэстаматыйным прыкладам фігуры лідара, на якую адбываецца калектыўны перанос індывідуальнага “Я”, дзякуючы чаму дасягаецца безагаворачнае падпарадкаванне іншых аднаму чалавеку. Дадзеныя “эксперыменту Мілгрэма” найбольш прыдатныя для аналізу характару Джэка Бёрдэна – цалкам незалежнага індывіда, якога аўтар заўсёды супрацьпастаўляе масам і які ірацыянальна падпарадкуецца самым брудным загадам Старка. Старк удала стварае ілюзію дэлегацыі сваіх паўнамоцтваў Джэку Бёрдэну, і апошні, адчуваючы сябе інструментам усталявання справядлівасці, выконвае любое заданне Боса.

Час як “павуціна” ёсць не чым іншым, як рэалізацыяй аднаго з законаў фармальнай логікі – закону тоеснасці, знакамітага арыстоцелеўскага “А ёсць А”. Па сутнасці, мы назіраем адну і тую ж з’яву – толькі з рознымі знакамі. “Павуціна” і ўлада ў рамане – гэта тэза і антытэза. Яны не розныя і не падобныя: у іх аднолькавы корань і супрацьлеглая сутнасць.

Што датычна кахання, то яно, як і любая іншая з’ява ў рамане, падпарадкаванае законам “павуціны”. Паколькі “Усе ваяры караля” прынята лічыць палітычным раманам, праблеме кахання ў ім асаблівай увагі, на першы погляд, не надаецца. Але пры больш падрабязным разглядзе

заўважна, што, пры амаль поўнай адсутнасці шаблонных стасункаў, паміж персанажамі існуюць больш тонкія сувязі, праявы якіх выдатна ілюструюць філасофскія ідэі аўтара. Так, напрыклад, няздольнасць "да-Бёрдэна" прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць паўплывала на тое, што падлеткавая закаханасць паміж Джэкам Бёрдэнам і Аннай Стэнтан, якая мела ўсе шансы скончыцца працяглым і трывалым шлюбам, скончылася расстаннем і доўгімі гадамі бессэнсоўных пошукаў з абодвух бакоў. І той вынік, які маюць героі ў фінале рамана, цалкам падпадае пад закон "павуціны": хаця Джэк Бёрдэн і Анна Стэнтан урэшце застаюцца разам, дзеля гэтага ім даводзіцца прайсці даволі пакручасты шлях.

Найменшая "матрошка" ўнутры рамана – гэта праблема ўзаемадзеяння Дабра і Зла. З вялікай літары – таму што ў дадзеным выпадку гэта не абстрактныя паняцці, а фундаментальныя катэгорыі, якімі вызначаецца напрамак дзеяння закону "павуціны": у залежнасці ад таго, у які бок схіляюцца вагі, чалавеку вяртаецца тое, чаго ён зрабіў больш. Можна сказаць, што развагі над суіснаваннем Дабра і Зла, немагчымасцю адмежаваць адно ад другога, Дабром і Злом як раўнапраўнымі часткамі чалавека – гэта і ёсць сэрца рамана "Усе ваяры караля". Менавіта ў гэтай кропцы сыходзяцца ўсе астатнія праблемы: адсюль вынікае і каханне з усімі яго складанасцямі, і Час як мера рэчаў, і "павуціна", якая ёсць следствам з прычыны сутыкнення гэтых дзвюх сіл.

Праблема Дабра і Зла ў рамане – адзіная праблема, якая мае хоць нейкі відавочны палітычны падтэкст. Але не толькі з-за таго, што некаторыя сюжэтныя лініі непасрэдна закранаюць палітычную сферу. Дабро і Зло тут цесна звязанае з праблемай улады ў самым шырокім яе разуменні: пачынаючы ад улады прымаць рашэнні і да ўлады ўсталёўваць маральныя законы – калі адзін чалавек вырашае за ўсё грамадства, што будзе добра для ўсіх. З цэнтралізацыі палітычнай улады ў руках аднаго чалавека пачынаецца гвалт, з цэнтралізацыі ўлады маральнага аўтарытэту – дэградацыя грамадства. Старк упэўнены, што Дабро нараджаецца са Зла. І кошт гэтага Дабра, кошт магчымасці яго нараджэння амаль супадае з будысцкай канцэпцыяй кармы. Сам Старк называе гэта тэорыяй гістарычных выдаткаў або тэорыяй маральнай нейтральнасці гісторыі – калі важны толькі вынік, а не тыя сродкі, дзякуючы якім гэты вынік стаў магчымы.

Вынік, які хоча мець Вілі Старк, значна важнейшы для яго за тое, якім коштам ён прыйдзе да гэтага выніку. Карма, або "павуціна", для самога губернатара спрацоўваюць найгоршым, але і самым яскравым чынам: забойствам ад рукі чалавека, які павінен быў стаць найлепшым інструментам дасягнення ўлады ў калекцыі Старка – ад рукі Адама Стэнтана.

Аналіз рамана "Усе ваяры караля" праводзіўся пры дапамозе метаду "рэцэптыўнай эстэтыкі", што дало магчымасць разглядаць твор без прывязкі яго да канкрэтнага гістарычнага часу, у які ён быў напісаны, і ў сувязі з актуальнымі праблемамі розных перыядаў, у тым ліку і цяперашняга часу. Метад "рэцэптыўнай эстэтыкі" таксама даў нам магчымасць звярнуцца да тэхнікі "close reading" адной з плыней амерыканскага фармалізму – "новай

крытыкі”, створанай пры непасрэдным удзеле Р. П. Уорана. Тэзіс “тэкст сам у сабе” рэалізуецца праз увядзенне ў аповед гісторыі Каса Мастэрна, якая дазваляе ўскосна адлюстраваць эвалюцыю светапогляду Джэка Бёрдэна. Менавіта вуснамі Каса Мастэрна фармулюецца адна з галоўных канцэпцый рамана – канцэпцыя “павуціны”.

Такім чынам, у рамане “Усе вояры караля” прадстаўлена арыгінальная аўтарская сістэма філасофскіх і этычных поглядаў, якая знаходзіць сваё увасабленне ў такіх праблемах, як праблема Часу, Дабра і Зла, улады, справядлівасці, кахання і г.д. Яны маюць глыбокі змест і не страчваюць характару “адвечных філасофскіх пытанняў”, але форма іх выражэння дазваляе чытачу наблізіцца да ўласнага вырашэння гэтых праблем на ўзроўні персанальнага ўспрыняцця і асэнсавання, што робіць раман актуальным для сённяшняга чытача.